Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 09:36:29

DOI:10.17951/sb.2017.11.383
Studia Białorutenistyczne 11/2017



IN MEMORIAM

Ігар Жук (13.06.1957–30.06.2017)

30 чэрвеня не стала Ігара Васільевіча Жука, доктара філалагічных навук, прафесара Гродзенскага ўніверсітэта. Адышоў у лепшы свет вядомы беларускі літаратуразнаўца, тэарэтык літаратуры, літаратурны крытык, член Саюза беларускіх пісьменнікаў, аўтар трох манаграфій (Żuk, 1998d; Żuk, 2003; Żuk, Lebiadziewicz, Pietruszkiewicz, Piatkiewicz, 2009), двух навучальна-метадычных дапаможнікаў (Żuk, 1997; Żuk, 1999b), больш за сотні навуковых і навукова-папулярных артыкулаў. А яшчэ – верны сябра, добразычлівы і чулы калега, любы муж, бацька і дзядуля.

Ігар Васільевіч атрымаў добрую ў сваім часе адукацыю, пасля Будслаўскай дзесяцігодкі (1974) скончыўшы філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1979) – галоўнага ўніверсітэта краіны – і аспірантуру пры ім (1982). Аднак месца ў сталіцы для разумнага і начытанага юнака з Мядзельшчыны, сына вясковых настаўнікаў, не знайшлося. Тады, у далёкім 1982–ім, яго прытуліла Гародня, і, як аказалася, прытуліла на ўсё астатняе жыццё. Працоўны шлях Ігара Васільевіча звязаны толькі з адной установай – Гродзенскім універсітэтам імя Янкі Купалы. Пачынаў з асістэнцтва, абараніўшы кандыдацкую дысертацыю (*Гражданственность молодой белорусской прозы (70–е годы)*, 1986), стаў дацэнтам кафедры беларускай літаратуры (1990). Акурат у самым пачатку 1990-х гадоў, складаных і адначасова светлых для ўсіх нас, Ігар Васільевіч ахвотна прыняў прапанову рэктара ўзначаліць ужо родны для яго факультэт беларускай філалогіі і культуры, і нядоўгія гады яго дэканства (1991–1996), паводле сведчанняў многіх калег і аднадумцаў, сталіся "залатым векам" гродзенскага філфака. На ўзлёце беларусізацыі ён акрылена песціў даўнюю мару "людзьмі звацца" – адбудаваць сярод філолагаў-купалаўцаў сваю незалежную "дзяржаву", сваю Маладую Беларусь, каб убачыць нацыянальную сістэму вышэйшай гуманітарнай адукацыі ў еўрапейскім кантэксце. Тое даводзіў на пасяджэннях Прэзідыума абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры і гарадской рады Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны. Апантаны беларушчынай жыў да апошніх дзён, ідэю высокай нацыянальнай годнасці прапагандаваў сярод студэнтаў, аспірантаў і калег.

Менавіта таму ва ўласных публікацыях, вытрыманых пераважна ў трагічным ключы, Ігар Васільевіч заўсёды імкнуўся засведчыць выключную складанасць і цярністасць шляху беларусаў да саміх сябе. І таму яго ўлюбёнцамі з беларускай літаратуры былі трое пісьменнікаў: Янка Купала (Żuk, 1999a, 2010a, 2016),

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 09:36:29

Якуб Колас (Żuk, 2006, 2008, 2010b) і Васіль Быкаў (Żuk, 2004, 2014, 2015). Прадметам даследавання ў розныя часы паўставалі загадкі аўтарства і метады атрыбуцыі тэкстаў беларускай літаратуры (Żuk, 1995, 1998a, 1998b), метрыка і метрадынаміка мастацкага выказвання (Żuk, 1998c, 1999c, 2005), памежныя формы "верша-прозы" ў беларускай літаратуры, наратыўная структура мастацкага твора, трансфармацыя таго ці іншага матыва ў літаратурнай свядомасці і яшчэ шмат што.

Напачатку 2000-х, пасля складанай аперацыі на неспакойным сэрцы Ігара Васільевіча, пачалося, як ён сам казаў, яго другое жыццё, у якім таксама ён паспеў зрабіць нямала: бліскуча абараніў доктарскую дысертацыю (*Празаічны тэкст: дынаміка рытмавага існавання (на матэрыялах беларускай літаратуры),* 2004), стаў прафесарам кафедры беларускай літаратуры (2005), выканаў шэраг арыгінальных навуковых праектаў, падрыхтаваў яшчэ дзве манаграфіі. Пад кіраўніцтвам прафесара І. В. Жука гродзенскімі студэнтамі ажыццёўлена нямала цікавых даследаванняў, што прыкметна вылучаліся сваёй навуковай навізной і сістэмным падыходам.

Наогул, асоба студэнта заўсёды стаяла для прафесара на першым плане. Уменне мысліць, разважаць, аналізаваць, але найперш – адчуваць мастацкае слова было для Ігара Васільевіча найважнейшым паказчыкам эфектыўнасці яго педагагічнай працы. Ён імкнуўся выхоўваць у сваіх вучнях найперш людзей высокай чалавечай культуры, людзей свядомых і мэтанакіраваных. Менавіта інтэлектуалаў, дапытлівых і кемлівых, марыў ён бачыць у беларускай навуцы, ахвотна "адгукаючыся" на самыя цікавыя даследаванні маладзейшых навукоўцаў, экспертуючы свежыя кандыдацкія і доктарскія дысертацыі ў Савеце пры БДУ, ці, пазней, адстойваючы іх у ВАКу. Такая праца, зразумела, забірала шмат часу і сіл. Але яна ніяк не замінала Ігару Васільевічу ўважліва сачыць за далейшымі поспехамі тых, каму ён сам даваў пропуск у навуковае жыццё.

Талент крытыка, прынцыповага і аб'ектыўнага, выяўляўся, акрамя шматлікіх водгукаў на кнігі і новыя мастацкія творы беларускіх аўтараў, у рэгулярным рэцэнзаванні навуковых манаграфій, артыкулаў, навучальна-метадычных дапаможнікаў і праграм. Прафесар І. В. Жук стала выступаў адказным рэдактарам шматлікіх зборнікаў навуковых прац, а таксама членам аргкамітэтаў канферэнцый, круглых сталоў, што ладзіліся ў Гродне і краіне. Прысутнасць яго асобы ў складзе навуковай рады часопісаў "Беларускае літаратуразнаўства", "Веснік ГрДУ", "Acta Albaruthenica", "Studia Białorutenistyczne", "Białorutenistyka Białostocka" – сведчанне высокай навуковай вартасці гэтых выданняў. Сваёй сумленнай і самаадданай працай прафесар заслужыў павагу і аўтарытэт у асяродку акадэмічных вучоных, якія яшчэ не аднойчы назавуць яго імя ў ліку перадавых беларускіх навукоўцаў і не раз узгадаюць як мудрага дарадцу і абаяльнага апанента.

Але ўсе мы будзем памятаць Ігара Васільевіча найперш добрым, мілым і светлым чалавекам.

Слава яму ў высокім небе і вечная памяць на беларускай шматпакутнай зямлі!

Надзея Чукічова

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 09:36:29

Bibliografia

Żuk, Ihar, Rodczanka, Wadzim. (1998a). Ab adnym padychodzie da atrybucyji mastackaha tekstu na padstawie matematycznaj teoryji raspaznawańnia wobrazau. W: *Wzaimodiejstwije litieratur w mirowom litieraturnom prociessie* (s. 394–398). Grodno: GrGU.

Żuk, Ihar. (1999a). Antałahicznaje jadro „Tutejszych": aktualii wywuczeńnia pierszaj dziei. W: *Miżnarodnyja Kupałauskija czytańni* (s. 275–282). Hrodna: HrDU.

Żuk, Ihar, Rodczanka, Wadzim. (1995). Atrybucyja litaraturnych tekstau z dapamohaj matematycznaj statystyki. *Wieści NAN Biełarusi. Sieryja humanitar. nawuk,* 2, s. 103–107.

Żuk, Ihar, Rodczanka, Wadzim, Waranowicz, Waleryj. (1998b) Atrybucyja twora: da mietodyki „szczylnaj" kadzirouki tekstu. *Wieści NAN Biełarusi. Sieryja humanitar. nawuk,* 1, s. 113–122.

Żuk, Ihar. (1997). *Biełaruskaja krytyka i litaraturaznaustwa (20–30 hh.)*. Hrodna: HrDU.

Żuk, Ihar. (1999b). *Biełaruskaja litaraturaznauczaja szkoła (20–hady)*. Hrodna: HrDU.

Żuk, Ihar. (2014). Bykauskaja apowieść: naratyunaja intryha i fokusny piersanaż. W: *Choriewskije cztienija* (s. 200–213). Grodno: OOO „JurSaPrint".

Żuk, Ihar. (2008). „Wieczny siużet" i „nowy" hieroj: „Symon-muzyka" Jakuba Kołasa u kantekście zmieny litaraturnaj paradyhmy. *Studia Białorutenistyczne,* 2, s. 183–206.

Żuk, Ihar. (2010a). „Widziennie" Baćkauszczyny, abo mietafizika szlachu u „naszaniuskaj" lirycy Janki Kupały. *Bialorutenistyka Bialostocka,* 2, s. 7–19.

Żuk, Ihar. (2010b). Dwa padarożży u „czużuju ziamlu": ab adnym miechanizmie etnicznaj samaidentyfikacyji u paemie Jakuba Kołasa „Nowaja ziamla". *Studia Białorutenistyczne,* 4, s. 207–218.

Żuk, Ihar. (2005). Inwariantnost' naczał: iz nabludienij nad mietriczieskim faktorom biełoruskoj prozy naczała XX stoletija. *Sławianowiedienije,* 1, s. 51–59.

Żuk, Ihar. (1999c). Kołanawyja simietryji u struktury prazaicznaha tekstu. W: *Litaratura, mowa, kultura: etnas u światle historyji i suczasnaści* (s. 171–178). Hrodna: HrDU.

Żuk, Ihar, Lebiadziewicz, Dzmitryj, Pietruszkiewicz, Ała, Piatkiewicz, Alaksiej. (2009). *Matyunaja prastora biełaruskaj litaratury paczatku XX stahoddzia*. Hrodna: HrDU im. J. Kupały.

Żuk, Ihar. (2004). „Piaskowisko" i „Karjer" Wasila Bykawa: pytannie identycznasci pierakładu rytmawaha konturu wykazwannia. W: *Szlach da uzajemnasci* (1, s. 318–326). Hrodna: HAUPP „Hrodz. druk.".

Żuk, Ihar. (2003). *Prazaiczny tekst: dynamika rytmawaha isnawannia*. Hrodna: HrDU im. J. Kupały.

Żuk, Ihar. (2016). Simwolika „sniehu" u paetycznaj swietabudowie liryki Janki Kupały. W: *Litaraturnyja suwiazi: prablemy imahałohii* (s. 128–139). Minsk: RIWSZ.

Żuk, Ihar. (1998c). „Stratnyja frahmienty" u mietradynamicy prazaicznaha wykazwannia. W: *Wzaimodiejstwije litieratur w mirowom litieraturnom prociessie* (s. 385–394). Grodno: GrGU.

Żuk, Ihar. (1998d). *Sustreczny ruch*. Hrodna: BFK.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 09:36:29

Żuk, Ihar. (2015). „U tumanie" Wasila Bykawa: try tezisy da hramatyki naratyunaj intryhi apowiesci. *Studia Białorutenistyczne,* 9, s. 181–202.

Żuk, Ihar. (2006). Uniwiersslii wobraznaj pamiaci: zhadki wakoł biełaruskaha szlachu u „Nowaj ziamli" Jakuba Kołasa. *Termapiły,* 10, s. 218–227.

UMCS